...ўсіх краёў злучайцеся

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 254 (1221) | СУБОТА, 1-га лістапада 1930 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене“

ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу „Чырвонай Зьмене“ IX Сьвіслацкая райконфэрэнцыя шле свае бальшавіцкае комсамольскае прывітаньне. Конфэрэнцыя запэўнівае, што ўся ўвага комсамольскай організацыі будзе накіравана на поўнае выкананьне і перавыкананьне промфінплянy, зьняцьце заводу з чорнай дошкі выкананьне дырэктывы партыі па колектывізацыі, ліквідацыю прарываў на загатоўках, праводзеньне рашучай барацьбы на два фронты—з правым, найбольш небясьпечным ухілам і „левымі“ загібамі, у якім-бы выглядзе яны ні праяўляліся, як у тэорыі, так і на практыцы.

Няхай жыве Ленінскі ЦК і яго баявы орган „Чырвоная Зьмена“!

Няхай жыве компартыя,—верны кіраўнік будаўніцтва!

РАЙКОНФЭРЭНЦЫЯ

Агонь па правых у комсамоле

Да канца выкрыць і разьбіць праваопортуністычную „тэорыю“ аб „крызісе“ саюзу

На конкрэтных фактах яшчэ больш мобілізаваць масы комсамольцаў на непрымірымую барацьбу супроць опортуністычных наскокаў зправа і „зьлева“

Двурушнікам няма мейсца ў шэрагах партыі і комсамоле

МАЦНЕЙ УДАРЫЦЬ ПА ПРАВЫХ ВЫЛАЗКАХ

Вынікі другога году пяцігодкі з усёй бясспрэчнасьцю сьведчаць аб правільнасьці курсу, аб рэальнасьці тэмпаў, узятых партыяй у галіне соцыялістычнага будаўніцтва.

Той факт, што ў шэрагу галін прамысловасьці мы выконваем пяцігодку ў 3 і 4 гады, той факт, што ў галіне колектывізацыі мы перавысілі ўжо плянавыя намёткі, што ў асноўных сельска-гаспадарчых раёнах вёска колектывізавана на 45 проц.—усё гэта з найбольшай яскравасьцю даводзіць аб поўным банкроцтве правых.

Партыя і рабочая кляса ў дастатковай ступені выкрыла і ўшчэнт разгромала ідэёвыя позіцыі правага опортунізму. Гэта, бязумоўна, ні ў якім разе не азначае, што гэтым самым ліквідаваны соцыяльныя карэньні, харчуючая глеба правага ухілу. Было-б у зьвязку з гэтай вялікай бязглуздзіцай — нічога агульнага ня маючай з бальшавізмам, з марксызмам, думаць, што правы ўхіл не ўяўляе рэальную небясьпеку на шляху нашага наступу на капіталістычныя элемэнты і выкарчоўваньня іх рэштак.

„Асноўнае зло правага опортунізму крыецца ў тым, што ён парывае з ленінскім разуменьнем клясавай барацьбы і скатваецца на пункт гледжаньня дробна-буржуазнага лібэралізму“ (Сталін, Політсправаздача на XVI зьезьдзе ЦК УсеКП(б).

Вось чаму XVI зьезд УсеКП(б) падкрэсьліў, што правы опортунізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай і абвясьціў несумяшчальным прапаганду і адстайваньне правых поглядаў з прабываньнем у шэрагах УсеКП(б).

Для комсамолу, лінія якога ёсьць —генэральная лінія партыі, правы ухіл уяўляе наменшую небясьпеку.

Больш шырокі соцыяльны склад, наяўнасьць новых, параўнальна слаба яшчэ выхаваных комсамольцаў,— спрыяючая глеба для праяў правага ухілу ў комсамоле.

Праявы правага опортунізму ў комсамоле характэрны імкненьнем затармазіць тэмпы павароту ЛКСМ да пытаньняў гаспадарчага будаўніцтва, пашыраць соцыяльны склад організацыі за лік яе асераднячваньня, што выцякае з тэорыі перавыхаваньня кулака; зьвесьці работу на паасобных вучастках да вузка-дзялянцкага практыцызму, выхалашчваючы політычны сэнс, адрываючы практычную работу ад агульна-політычных задач. Правыя ў комсамоле недаацэньваюць работу з беднатой і батрацтвам, не жадаюць выконваць лёзунгу аб стопроцэнтным ахопе рабочай моладзі комсамолам.

На бачачы той вялікай актыўнасьці мас працоўнай моладзі, якая разгортваецца на фоне агульнаўзрослай політычнай актыўнасьці працоўных мас, упадаючы ў паніку і замяшаньне перад цяжкасьцямі нашага росту, якія зьмяшчаюць у сабе сілы для перамог гэтых цяжкасьцяй, абагульваючы факты паўменьня асобнымі камітэтамі стаць на чале політычнай актыўнасьці мас комсамольцаў і працоўнай моладзі—правыя опортуністы пачынаюць енчыць аб крызісу актыўнасьці комсамолу і крызісу актыву.

Беспадстаўнасьць гэтых праваопортуністычных енкаў тым больш выразна бачна, калі мець на ўвазе тыя сапраўдныя посьпехі, якіх дабіўся саюз, змагаючыся па ўсіх вучастках за генэральную лінію партыі.

„УсеЛКСМ зараз зьяўляецца адным з самых баявых атрадаў на баявых вучастках соцыялістычнага будаўніцтва. Комсамол дабіўся вялізарных зрухаў у бок узмацненьня свайго ўдзелу у гаспадарчым і культурным жыцьці краіны. Ён паказаў і паказвае вузоры багатай ініцыятывы па частцы ўвядзеньня форм комуністычных адносін да працы“. (З перадавой „Праўды“ да IX зьезду УсеЛКСМ).

Толькі махровыя правыя опортуністыя, панікёры могуць заяўляць аб крызісе.

Аднак, гэтыя выступленьні невыпадковы. Гэта тым больш характэрна, што яны (выступленьні) маюць месца напярэдадні комсамольскіх зьездаў, жадаючы, такім чынам, атакаваць лінію партыі па пытаньню саюзнага руху.

Ня так даўно на сваіх старонках „Комсамольская Праўда“ выкрыла права-опортуністычнае выступленьне работнікаў в Ленінградзе —Бутыркіна і Мінаева, якія заявілі, аб „крызісу саюзу“, аб „безактыўнасьці“.

Аналёгічнае выступленьне мела месца на апошнім пленуме ЦК ЛКСМБ з боку члена ЦК, сэкратара Горацкага райкому ЛКСМБ сав. Целешава, які заявіў, што мы „перажываем крызіс актыўнасьці нашай комсамольскай організацыі і крызіс актыву“.

Гэтае выступленьне атрымала рашучае асуджаньне з боку пленуму ЦК, як опортуністычнае, аднак пленум няправільна кваліфікаваў гэтае выступленьне, даўшы яму характарыстыку, як „левы“ загіб.

Тав. Целешаў падаючы заяву пленуму аб прызнаньні памылковым сьцьверджэньня аб крызісе, усё-ж пад шыльдай довадаў аб „вялікім недахопе“ актыву працягвае адстайваць сваю „тэорыю“, што па сутнасьці зьяўляецца агіднейшым двурушніцтвам.

Зьмяшчаемая сёньня пастанова ЦК ЛКСМБ гаворыць аб тым, што бюро ЦК і яго орган „Чырвоная Зьмена“ дапусьцілі політычную памылку, не завайстрыўшы своечасова ўвагі організацыі на гэтай права-опортуністычнай вылазцы з мэтай яшчэ большай мобілізацыі мас комсамольцаў на барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі нашай партыі.

Выступленьні правых опортуністых, двурушнікаў у комсамоле ў час прадзьездаўскай падрыхтоўкі прымушаюць нас з найбольшай пільнасьцю праводзіць падрыхтоўчую працу да зьездаў, зьдзейсьняючы задачу павароту саюзу, з яшчэ большай непрымірымасьцю біць па ўсялякіх опортуністычных наскоках на партыйную лінію, як зправа, так і зьлева.

Комсамольскія камітэты і ячэйкі на аснове пастановы бюро ЦК ЛКСМБ павінны безадкладна на райконфэрэнцыях і сходах ячеек ЛКСМБ завастрыць увагу організацыі на сутнасьці гэтых права-опортуністычных двурушніцкіх выступленьнях, мобілізаваўшы масы комсамольцаў на яшчэ больш жорсткую барацьбу з правым ухілам і яго конкрэтных праявах у комсамоле—як галоўнай небясьпекай.

Двурушнікам няма мейсца ў комсамоле.

„Комсамол не быў і не можа быць політычна нэйтральнай організацыяй.

Лінія УсеЛКСМ — ёсьць лінія УсеКП(б).

Вось чаму комсамол рашуча змагаўся і надалей пав нен змагацца за лінію нашай партыі і яе ЦК“ („Праўда“).

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

ад 29 кастрычніка 1930 г.

Бюро ЦК ЛКСМБ адзначае, што выступленьне сябра ЦК (сэкратара Горацкага Райкамолу) тав. Целешава на пленуме ЦК ЛКСМБ аб тым, **што „адкрыта кажучы, на сёньняшні дзень перажываем крызіс актыўнасьці нашай комсамольскай організацыі і крызіс актыву“**, г. зн.,—нявер'е ў сілы Саюзу і актыву, боязьнь цяжкасьцяй, якія стаяць на шляху соцыялістычнага будаўніцтва, апусканьне рук у барацьбе з клясавым ворагам, што па сутнасьці зьяўляецца праваопортуністычным выступленьнем.

Бюро ЦК лічыць, што пленум ЦК ЛКСМБ даў няправільную кваліфікацыю права-опортуністычнага выступленьня Целешава тым, што кваліфікаваў яго, як „левы“ наскок на лінію партыі.

Прызнаць, што бюро ЦК ЛКСМБ дапусьціла політычную памылку, своечасова не скарыстаўшы права-опортуністычнага выступленьня Целешава, для яшчэ большай мобілізацыі мас комсамольцаў на барацьбу з правым ухілам.

Выходзячы з гэтага бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Паставіць пытаньне перад пленумам ЦК ЛКСМБ аб адмене рашэньня па справе Целешава і падцьверджаньні прынятай аб гэтым пастановы бюро ЦК ЛКСМБ ад 29 кастрычніка 1930 г.
2. Лічыць нездавальняючай заяву Целешава, якая, замест прызнаньня допушчаных політычных памылак і рашучай барацьбы з імі, працягвае і надалей права-опортуністычныя памылкі размовамі аб тым, што „не хапае актыву...“ у сувязі з чым Целешава з работы сэкратара Горацкага РК ЛКСМБ—зьняць.
3. Прапанаваць РК і ячэйкам ЛКСМБ абгаварыць гэта рашэньне на райконфэрэнцыях, сходах ячэек, скарыстаўшы вурокі права-опортуністычных памылак Целешава ў справе яшчэ большай мобілізацыі мас комсамольцаў на барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць правага опортунізму, як галоўнай небясьпекі, а таксама і „левых“ загібаў, узмацняючых правы ўхіл. Пад гэтымі задачамі павінна прайсьці ўся падрыхтоўчая работа да IX-га зьезду УсеЛКСМ і X-га ЛКСМБ.
4. Даручыць „Чырвонай Зьмене“ тэрмінова праз друк шырока растлумачыць політычны сэнс права-опортуністычных памылак Целешава, мобілізаваўшы яшчэ больш масы комсамолу на барацьбу супроць рознага роду опортунізму, у якіх бы выглядах ён ні праяўляўся.
5. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

На конфэрэнцыі Кастрычнікаўскага раёну

Спрэчкі па дакладу тав. Рамізевіча аб рабоце ЦК ЛКСМБ

ЦК ня ўдарыў як сьлед па права-опортуністычнай вылазцы Целешава

Тав. ДУБІНСКІ („Комсом. Правда“)

Раней усяго прывітаньне ад рэдакцыі „Комсомольской Правды“ „Комсамольская Правда“ не сумняваецца, што Кастрычнікаўская раённая конфэрэнцыя на падставе разгорнутай крытыкі саўпраўды па-бальшавіцку вырашыць усе пытаньні, якія стаяць на яе павестцы дню.

Вы ведома ведаеце аб нядаўным права-опортуністычным выступленьні двух комсамольскіх работнікаў Мінаева і Бутыркіна ў Ленінградзе з заявымі аб крызісе Саюза. Таксама імкнуўся атакаваць лінію комсамолу і член ЦК ЛКСМБ, сэкратар Горацкай раённай організацыі—Целешаў.

На апошнім пленуме ЦК Беларускага комсамола Целешаў заявіў: „Адкрыта кажучы мы зараз перажываем крызіс актыўнасьці комсамольскай організацыі, крызіс актыва“. (сьценаграма вячэрняга паседжаньня пленуму 8-га кастрычніка, ліст 2-гі). На другі дзень пасьля вылазкі Целешаў па патрабаваньню пленуму падаў заяву, дзе з аднаго боку прызнаваў свае памылкі, адмяжоўваўся ад іх, а з другога боку „папярэджваў“ аб маючымся ў комсамоле колёсальным недахопе актыва, г. зн. па існасьці паўтараў тую-ж права-опортуністычную тэорыю аб крызісе актыўнасьці ў Саюзе.

Як-жа рэагавалі бюро і пленум Цэнтральнага Камітэта на Целешаўскае нічым не прыкрытае права-опортуністычнае выступленьне?

Надзвычайна нездавальняюча. Політычна яўна-памылкова.

Задаволіўшыся двурушніцкай заявай Целешава пленум пакінуў яго ў сваім складзе, даверыўшы ў далейшым кіраваць Горацкай раённай організацыяй. Бюро ЦК гэтую політычную памылку яшчэ паглыбіла. Спробы Целешава атакаваць перад IX зьездам лінію комсамола і партыі па існасьці ад організацыі былі захаваны.

Бюро ЦК пальцам не шавяліла для мобілізацыі організацыі на барацьбу з права-опортуністычнай тэорыяй крызісу комсамолу, які прапагандзіраваўся ў Беларусі Целешавым.

Работнікі ЦК могуць нам супярэчыць, што Менскі гарадзкі актыў асудзіў выступленьне Целешава, што Менскі актыў у курсе справы.

Бязумоўна, значная колькасьць вас дэлегатаў Кастрычнікаўскай раённай конфэрэнцыі была на Менскім активе, а хто з вас ведаў з выступленьнем Целешава, хто ведае аб вылазцы Мінаева і Бутыркіна?

Кажучы аб політычных памылках пленуму і бюро ЦК нельга абыйсьці маўчаньнем і паводзіны ЦО ЛКСМБ „Чырвоную Зьмену“ у гэтым пытаньні.

Прадстаўнікі „Чырвонай Зьмены“ былі на пленуме ЦК. Яны добра ведалі аб выступленьні Целешева і аб зьвязаных з ім памылках ЦК. Аднак, „Зьмена“ і да гэтага часу маўчыць. Такія нічым не апраўданыя паводзіны інакш як об'ектыўным прымірэнцтвам да права-опортуністычнага выступленьня Целешава ня можа быць названы.

Мы ўпэўнены, што Кастрычнікаўская раённая конфэрэнцыя асудзіць паводзіны ЦК і „Чырвонай Зьмены“, патрабуючы прызнаньня допушчаных політычных памылак і неадкладнай мобілізацыі беларускай комсамольскай організацыі на барацьбу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, адначасова ня спыняючы барацьбы і з „левымі“ загібамі.

Працяг спрэчак на 2 стар

ПАД ЗНАКАМ БАРАЦЬБЫ ЗА ТЭМПЫ,

НА АСНОВЕ РАЗГОРНУТАЙ САМАКРЫТЫКІ,

конфэрэнцыі падагульваюць вопыт і вызначаюць шляхі далейшай упартай барацьбы за генэральную лінію партыі

На конфэрэнцыі Кастрычнікаўскага раёну

Спрэчкі па дакладу тав. Рамізевіча аб рабоце ЦК ЛКСМБ

(Праця̆г. Пачатак чытай на 1-й старонцы)

На дакладу ЦК ЛКСМБ т. Рамізэвіча на 3 конфэрэнцыі Кастрычнікаўскага раёну разгарнуліся шырокія спрэчкі.

Сапраўды бальшавіцкай самакрытыкай дэлегаты конфэрэнцыі—лепшыя прадстаўнікі кастрычнікаўскай комсамольскай організацыі — абгаварвалі становішча комсамолу Беларусі.

Дэлегаты ў сваіх выступленьнях асабліва завастралі пытаньне на барацьбе комсамолу з правым ухілам, як найбольш небясьпечным на даным этапе, і „левымі" загібамі.

Пытаньню ўдзелу комсамолу ў соцспаборніцтве і ўдарніцтве прысьвечана значная частка спрэчак.

— 17 проц. комсамольцаў не зьяўляюцца ўдарнікамі, гэта значны прабел у рабоце комсамолу Беларусі,—гаворыць тав. Янавіцкі. Яго падтрымлівае і шэраг іншых дэлегатаў. Агульная думка конфэрэнцыі ў гэтым пытаньні зводзіцца да таго, што комсамол, маючы значныя дасягненьні ў пытаньні павароту тварам да вытворчасьці, організацыі соцспаборніцтва і ўдарніцтва, усё ж адстае ад тэмпаў у гэтай рабоце.

Абгаварэньне работы комсамолу на вёсцы заняло далёка не апошняе месца ў працы конфэрэнцыі.

Комсамол слаба ўдзельнічае ў колектывізацыі вёскі. Частка комсамольцаў не пашла ў колгас,—гаворыць тав. Пілатаў.

На пытаньнях сувязі гораду з вёскай спыняецца шмат дэлегатаў.

Партыйна-комсамольская організацыя заводу „Бальшавік" праявіла праваопортуністычную лінію ў падрыхтоўцы кадраў, якая выразілася ў зачыненьні ФЗВ скурнікаў, а ЦК у гэтым напрамку нічога не зрабіў,—гаворыць т. Кантар.

Наогул пытаньне падрыхтоўкі кадраў і праца комсамольскіх ячэек навучальных установаў занялі вялікае месца ў спрэчках па дакладу ЦК. Аб гэтым гаварылі тав.: Касьцюковіч, Пінчук, Савонаў і інш.

Аб дрэнным становішчы піонэрорганізацыі, якая зусім нічога не зрабіла ў галіне політэхнізацыі школ, гаворыць тав. Акульнікаў, яго падтрымліваюць і іншыя дэлегаты.

Тав. Астапенка ў сваёй прамове заявіў:

— Шэфства комсамолу над АБВШ ажыцьцяўляецца дрэнна. Аб сувязі рабочых організацый з Чырвонай арміяй гаварыла амаль палова выступаўшых у спрэчках.

Тав. Шасін у спрэчках адзначыў, што ЦК ЛКСМБ зусім не кіраваў работай моладзі ў сампрамысловай коопэрацыі.

Пасьля заключнага слова тав. Рамізевіча конфэрэнцыя прыняла пастанову, у якой політычная лінія ЦК прызнана правільнай, практычная праца здавальняючай.

Энтузіязм комсамолу—на рашаючыя вучасткі соцбудоўлі

Прамова тав. Рындзіча (ЦК ЛКСМБ)

Комсамол Беларусі павінен даць адказ, як ён выканаў рашэньні ЦК УсеЛКСМ па дакладу ЦК ЛКСМБ.

ЦК ЛКСМБ павінен адчытацца ў тым, як ён кіраваў організацыяй па выпраўленьню становішча ў ёй.

Рашаючым у ацэнцы становішча ў організацыі і кіраўніцтва ЦК зьяўляецца тое, наколькі організацыя павярнулася тварам да гаспадарчага будаўніцтва, наколькі тэмпы работы адпавядаюць тэмпам соцыялістычнага будаўніцтва.

На гэтыя пытаньні неабходна сказаць, што стрыжнем работы комсамольскай організацыі зьверху да нізу зьяўляюцца пытаньні гаспадарчага будаўніцтва. Аднак, калі мы возьмем комсамол вытворчых організацый, дык знойдзем, што побач з вялікаю ўвагаю, якую ўдзяляюць ячэйкі пытаньням жыцьця прадпрыемстваў, мы маем адставаньне ў тэмпах. Гэта адставаньне выяўляецца ў тым, што пытаньні плянаваньня, пытаньні рэконструкцыі прамысловасьці ня сталі яшчэ ў цэнтры ўвагі організацыі, сустрэчны плян пакуль толькі пачатак удзелу комсамолу ў плянаваньні. Плянаваньне, як гэткае, барацьба за плян ня сталі штодзённай работай. Гэта адносіцца ня толькі да ячэек, гэта належыць аднесьці і да райкомаў і да ЦК.

Плянаваньне ня стала цэнтрам штодзённай работы і камітэтаў. Гэта па-першае.

Па-другое, адставаньне заключаецца яшчэ і ў тым, што з абсягу гледжаньня комсамолу калі-нікалі выпадаюць рашаючыя вучасткі соцыялістычнага будаўніцтва. Сюды можна аднесьці будаўніцтва новых фабрык і заводаў: шоўкавая фабрыка, Гомсельмаш, Цэмантны завод і г. д. Сюды-ж адносіцца і будаўніцтва электрастанцый, мэліорацыя балот і інш. Тут комсамол ня выявіў сябе.

Была толькі нясьмелая спроба—гэта мобілізацыя комсамолу для работы на шоўкавай фабрыцы.

На вёсцы мы маем становішча, якое значна адрозьніваецца ад становішча ў мінулым. Цяпер ужо тыя паасобныя ячэйкі, цэнтрам працы якіх не зьяўляецца ўдзел у сельскай гаспадарцы, наогул знаходзяцца ў разбураным выглядзе. Пытаньні пасеўкампаніі, уборкі ўраджаю, хлеба і бульбазагутовак зьяўляюцца асноўнымі ў рабоце вясковых організацый. Аднак, для вясковай організацыі характэрна, па-першае, тое, што комсамол дрэнна злучаў удзел у паасобных кампаніях з задачамі колектывізацыі, барацьба за колгас ня стала ў патрэбнай ступені ў цэнтры паўсядзённай работы, пераважнай большасьці вясковай організацыі, па-другое,—работа вялася паасобку. Роля комсамолу, як організатара мас моладзі на барацьбу за соцыялістычную перабудову вёскі, вельмі нізкая.

Пагэтаму асноўная ўвага організацыі павінна быць завострана на барацьбе за пасіленьне тэмпаў комсамольскай работы, за накіраваньне энтузіязму комсамольскай організацыі на рашаючыя вучасткі соцыялістычнай будоўлі.

Цяпер аб памылках пленума ЦК. Пленум ЦК не адносіўся да выступленьня т. Целешава прымірэнча. Ён ацаніў выступленьне Целешава, як яўна-опортуністычнае выступленьне.

Кваліфікацыя пленумам выступленьня Целешава „левым" не зьяўляецца політычнай памылкай.

Тое, што тав. Целешава не зьнялі з работы тлумачыцца тым, што т. Целешаў прызнаў свае памылкі ў заяве, якая падана там-жа на пленуме. Памылка бюро ЦК, але ня пленума заключаецца ў тым, што бюро сваечасова не завострыла ўвагі організацыі на выступленьні Целешава ў мэтах яшчэ большай мобілізацыі організацыі на барацьбу з правым опортунізмам, як галоўнай небясьпекі і „левымі" загібамі.

У гэтым заключаецца і памылка „Чырвонай Зьмены".

Трэцяя Фрунзэўская

УСТУПАЕМ У НОВЫЯ БАІ

30 кастрычніка а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дому Працасьветы адчынілася 3-я фрунзэўская раённая конфэрэнцыя ЛКСМБ.

Пасьля абраньня дзелавога прэзыдыуму, у які ўвайшлі т. т. Палякоў, Шпэктараў і іншыя, конфэрэнцыя пад бурныя воплескі ўсяе залі абрала ганаровы прэзыдыум у складзе політбюро ЦК УсеКП(б), бюро ЦК КП(б)Б і генаральнага сэкратара ЦК УсеЛКСМ тав. Косарава.

У сваім уступным слове сэкратар райкому тав. Райхельсон адзначыў, што за апошні час фрунзэўская організацыя мае вялікія посьпехі ў справе барацьбы за выкананьне промфінпляну. Комсамольскі колектыў зав. „Комунар", стварыўшы ўдарныя брыгады, комсамольскія цэхі, дабіўся ў сваёй працы выкананьня промфінпляну, зьніжэньня сабекошту, павышэньня якасьці продукцыі і г. д.

Комсамольскі колектыў ф-кі „Кастрычнік" атрымаў за сваю ўдарную працу сьцяг ВСНГБ. У некаторых мясцох комсамольскія колектывы ня здолелі яшчэ павярнуцца тварам да вытворчасьці. За непасьпяховае праводзеньне працы па выкананьню промфінпляну распушчан колектыў „Утыль".

З вялікім дакладам аб працы ЦК ЛКСМБ выступіў сэкратар ЦК т. Палякоў.

Пасьля дакладу конфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене". У сувязі з 5 гадавінай сьмерці т. Фрунзэ конфэрэнцыя ўшанавала ўставаньнем памяць таварыша Фрунзэ, імя якога носе організацыя.

Пачаліся спрэчкі.

Першым у спрэчках выступіў т. Вэнзэль (прадстаўнік ЦК ЛКСМБ, ЦП саюзу будаўнікоў).—У сваёй прамове тав. Вэнзэль адзначыў, што ЦК комсамолу павінен больш зьвяртаць увагі на справу падрыхтоўкі кадраў. Асеньні набор у ФЗВ прайшоў нездавальняюча. Па школах набрана толькі каля 15 проц. рабочай моладзі, а большасьць зьяўляецца дзецьмі служачых і саматужнікаў. У будаўніцтве школ маюцца вялікія прарывы. Да гэтага часу адрамантавана толькі 1 школа швэйнікаў.

У справаздачы т. Палякоў больш гаварыў аб буйных прадпрыемствах Менску, не закранаючы ўсю беларускую прамысловасьць.

Тав. Бялявін у сваёй прамове зазначыў, што апошні склад ЦК з сваёй працай у асноўным справіўся і выправіў допушчаныя раней памылкі ў справе барацьбы з нацыянал-дэмократызмам, а таксама ў колгасным будаўніцтве.

Будаўнічыя пляны ня выкананы. Комсамол Беларусі амаль нічога не зрабіў для ліквідацыі недахопу, які заўважваецца ў будаўнічых матар'ялах. Цагельныя заводы выканалі свой плян толькі на 45 проц. Партыйнае кіраўніцтва комсамолу ў многіх мясцох недастатковае.

Тав. Умрэйка.—Пытаньню беларусізацыі організацыя не ўдзяліла належнай увагі. Політвучоба ў раёне пастаўлена дрэнна. Комсамол павінен быць мобілізаваны на політвучобу. Мобілізацыя комсамольцаў у пэдагогічныя ўстановы прашла недастаткова. Большасьць комсамольцаў ідзе вучыцца ў індустрыяльныя тэхнікумы, увільваючы ад пэдагогічнай працы, гэтым самым пакідаючы фронт культурнага будаўніцтва.

Т. Хазанаў перадаў шчырае чырвонаармейскае комсамольскае вітаньне Фрунзэўскай раённай конфэрэнцыі. У сваёй прамове тав. ... адзначыў, што ў справаздачы дана мала ўвагі мілітарызацыі комсамольцаў. Пастановы 16 зьезду УсеКП(б) аб узмацненьні абароназдольнасьці краіны павінны быць выкананы.

Уся конфэрэнцыя праходзіць незвычайна бадзёра, пад лёзунгам праўды бальшавіцкай самакрытыкі.

Да X зьезду ЛКСМБ



Тав. Палякоў—прашу слова!

Некалькі пытаньняў саюзнай працы на вёсцы *)

Пэрыод соцыялістычнай рэконструкцыі нашай народнай гаспадаркі паставіў перад комсамольскай організацыяй новыя задачы—перабудову сваёй працы, хуткія тэмпы. У выкананьні гэтых задач комсамол Беларусі мае вялікія дасягненьні. Аднак, мы павінны адзначыць, як гэта адзначыў XVI парт. зьезд словамі тав. Кагановіча, што „тэмпы працы КСМ організацыі адстаюць ад тэмпаў соцыялістычнай перабудовы нашай гаспадаркі". Я хачу застанавіцца на некалькіх пытаньнях саюзнай працы на вёсцы.

Мы дрэнна праводзім масавую работу з моладзьдзю на вёсцы

Мы павінны адзначыць, што зараз наша праца, наш уплыў на беспартыйную моладзь вёскі (я разумею батрацка-бядняцкую, серадняцкую моладзь) паслаблі. Амаль уся наша організацыя на вёсцы рэорганізуецца з вясковых ячэек у колгасныя і гэтыя ячэйкі амаль усю сваю працу праводзяць толькі ў колгасах. У выніку мы маем цэлы шэраг выпадкаў ня толькі слабога ўдзелу беспартыйнай працоўнай моладзі ў соцбудаўніцтве, але нават у паасобных мясцох выступленьне бядняцка - серадняцкай моладзі супроць колектывізацыі і мерапрыемстваў партыі на вёсцы.

Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што з прычыны нашай слабой пастаноўкі працы сярод бядняцка-серадняцкае моладзі, гэтую моладзь адваёўвае пад свой уплыў клясава варожы элемэнт. Барацьба за моладзь ідзе.

Мы маем зараз у некаторых раённых організацыях зусім малы рост за лік батрацкай, бядняцкай і серадняцкай моладзі, якая яшчэ покуль не ў колгасах. У той-жа час мы маем выпадкі амаль нагалоўнага росту за лік колгасна-серадняцкае моладзі і нават былай заможнай моладзі, якая зараз знаходзіцца ў колгасе.

Праўда, селянін-серадняк, уступіўшы ў колгас, з нашага саюзьніка стаў апорай савецкай улады на вёсцы, але-ж такі нагалоўны ахоп КСМ організацыяй серадняцкай моладзі (колгасьнікаў) без некаторай недаацэнкі яго соцыяльнага паходжаньня можа прывесьці нашу організацыю да нежаданых вынікаў.

Вывад такі: мы слаба працуем з батрацкай і бядняцка-серадняцкай моладзьдзю некалгасьнікаў, ня ўцягваем яе ў нашу працу з такім разьлікам, каб яна ўступіла ў колгас і КСМ. Мы павінны памятаць, што барацьба за моладзь ідзе, а ячэйкі шмат дзе гэтага я... ня эразумелі.

Памятаць аб бедняку—заўтрашнім колгасьніку

Партыя дала цэлы шэраг ды... тыў па гэтай галіне. Партыя ... нам магчымасьць кіраваць гру... беднаты. Як мы выконваем гэт... Вельмі слаба. Цэлы шэраг раён... організацый нічога ня робіць ... бліва з тою беднатой, якая ня ў... піла покуль што у колгас.

Вывад такі:—мы дрэнна прац... Асабліва гэта акрэсьліваецца ў ... вёсках і с-савеце, дзе няма ... тыйнай ячэйкі,—там, дзе ко... мольскія ячэйкі павінны был... тую працу паставіць у цэнтр ў... Нашы ячэйкі вельмі часта ... каюцца ў рамках колгасу. Між ... ва ўмовах Беларусі, дзе яшчэ ... раважная частка бядняцка-се... няцкіх гаспадарак яшчэ пакуль ... не ў колгасе пытаньне раз... ваньня працы з беднатой, ... пеньне сярод яе політычна-ма... працы павінна займаць важнае ... ў нашай працы.

Комсамол—у адказе з... падрыхтоўну кадраў д... сельскай гаспадаркі

Комсамол на фронце падрых... кадраў для прамысловасьці да... вялікіх дасягненьняў, але у ... падрыхтоўкі кадраў для сел... гаспадаркі ня можам мы г... сказаць. Мы павінны напярэ... нашага Х-га зьезду ЛКСМБ бальшавіцку прызнацца, што ... самол на фронце падрыхтоўкі ... раў для сельскай гаспадаркі вельмі і вельмі мала чаго зр... богата чым вінаваты ў гэтым.

Тэмпы колектывізацыі сел... гаспадаркі апярэдзілі ўсе плян... наметкі. Процэс колектывізацыі ... вялічыў запатрабаваньне на к... Ко самол павінен узяцца за ... шэньне гэтай задачы. Мы ч... ад Х-га зьезду адпаведных ра... няў па лініі падрыхтоўкі ... для сельскай гаспадаркі.

Вось, па-мойму, некалькі слабых вучасткаў нашай прац...

Мы чакаем, што Х-ты зьезд ... самолу Беларусі дасьць нам шэраг рашэньняў, якія пад... баяздольнасьць нашай організ... На грунце гэтых рашэньняў ... пойдзем уперад, вядучы за ... батрацка-бядняцкую і серадн... колгасную моладзь на штурм ... дацыі прарыву, на штурм ба... бы за генэральную лінію партыі.

У бліжэйшай прадзьездаўскай ... ронцы я выступлю з конкр... прапановамі, як па маей ... патрэбна палепшыць працу ... кранутых вышэй пытаньнях.

Фіал...

*) Артыкул зьмяшчаецца ў парадку абгаварэньня.

Сёньня зачыняецца першая Ўсебеларуская

Неабвяржымы доказ соцыялістычнага росту

Сёньня заканчвае сваю работу першая Ўсебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі і прамысловасьці. Пасьля 3-х месячнага існаваньня мы можам падвесьці некаторыя палітычныя вынікі яе работы. Гэтыя вынікі цікавы для нас менавіта таму, што яны зьяўляюцца дэманстрацыяй на натуральных, макетных і дыяграмных паказальніках посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, а той патос працоўных мас, з якім сустракалася выстаўка, паказвае магутнасьць мобілізуючых сіл нашых посьпехаў. А ўсё гэта, разам узятае, гаворыць аб нашай удачы-популярызацыі дасягнутых посьпехаў і выкарыстаньні іх для далейшых заваёў.

Посьпехі—мобілізатары

Яшчэ ў першыя дні работы выстаўкі рэдакцыя выставачнай газэты „Соцыялістычная Рэконструкцыя" атрымала тэлеграму: „у дзень адчыненьня выстаўкі колгасьнікі і частка аднаасобнікаў Рагачоўшчыны адвезлі чырвоным абозам 3300 пуд. збожжа", а ў Жлобіншчыне ... „за адзін толькі дзень колгасамі здана кооперацыі 300 фурманак збожжа". Гэтыя факты ўжо зьявіліся першымі прадвесьнікамі новага ўздыму хвалі энтузіязму працоўных мас, з якім яны спаткалі выстаўку. Аб гэтым уздыме таксама сьведчаць тысячы запісаў у дзесятках сшыткаў, якія знаходзяцца ў павільёнах, аб гэтым сьведчаць зафіксаваныя, часта зусім няпісьменным почаркам, уражаньні, выказаныя ў лістох, якія дасылаліся экскурсантамі ў газэту „Соцыялістычная Рэконструкцыя". А лепш за ўсё сьведчыць хоць-б тое, што толькі ў адной газэце „Соцыялістычная Рэконструкцыя" за час работы выстаўкі былі надрукаваны заявы ад 105 аднаасобнікаў аб уступленьні пасьля агляду выстаўкі ў колгасы. І ня толькі аб уступленьні. Аднаасобнікі-бедьнякі і серадьнякі давалі абяцаньні быць актыўнымі арганізатарамі колгасаў і выклікалі на гэта другіх.

Вялікую зацікаўленасьць выстаўкай мы мелі ня толькі з боку шырокіх працоўных мас Савецкага Саюзу, але і замежных краін. Прадстаўнікі лейпцыгскіх рабочых Нямеччыны, т. Бэсьлер і Рыхтэр, якім давялося наведаць выстаўку, у сваіх уражаньнях, у гутарках з супрацоўнікамі выставачнай газэты, выказвалі вялікае захапленьне нашымі посьпехамі.

Пасьля звароту ў Нямеччыну, у дасланым у рэдакцыю выставачнай газэты лісьце, яны пісалі: „Вашы посьпехі гартуюць нас, замежных пролетараў, да новых боек. Ваша вялікая выстаўка ў Менску паказвае, што і сельская гаспадарка, і прамысловасьць, і культурны фронт маюць вялізарныя дасягненьні. Аб вашых дасягненьнях павінны ведаць пролетары захаду".

Вымушаныя „ашаламленьні"

Некаторыя замежныя вучоныя і прадстаўнікі буржуазных колаў, наведаўшы выстаўку, вымушаны былі прызнаць нашы дасягненьні, хоць буржуазія і ўзводзіць на СССР усякія паклёпы. Так, асыстэнт Брэслаўскага унівэрсытэту Нямеччыны—доктар інжынэр Ку...—у сваіх водгуках аб выстаўцы, у выставачнай газэце „Соцыялістычная рэконструкцыя" ад ... лістапада 1930 г. № 18, піша: „Уражаньне, вынесенае мною ад ... наведваньня беларускай выстаўкі сельскае гаспадаркі і прамысловасьці проста—„ашаламляючае", галоўным чынам, у тым сэнсе, што ў выстаўцы, як у люстры адлюстраваўся вялізарны культурны зрух, які адбыўся за 10 год у Беларусі, аб якім нельга было-б думаць у даваенны час".

Паданыя прыклады гавораць аб выстаўцы, як аб фактары, што прыкоўвае да сябе ўвагу ня толькі працоўных краю Саветаў, але-ж працоўных капіталістычных краёў і нават прадстаўнікоў буржуазных колаў.

Такая ўвага і такі рэволюцыйны патос, з якім працоўныя, ня толькі СССР, але і замежных краёў, сустракалі выстаўку, суправаджаліся абвастраньнем клясававарожай дзейнасьці кулацтва і іншых варожых элемэнтаў, накіраванай супроць выстаўкі. Кулакі і падкулачнікі карысталіся ўсімі сродкамі, каб адцягнуць увагу працоўных мас ад выстаўкі.

Аб многіх фактах агітацыі расказвалі экскурсанты.

Праўда аб СССР—да замежных працоўных

Варожая дзейнасьць супроць выстаўкі праводзілася ня толькі клясавымі ворагамі ўнутры савецкага краю, замежная буржуазія ўсякімі мерамі перашкаджала прыцёку вестак аб выстаўцы да замежных працоўных. Пілсудчыкі ў Стоўпцах конфіскавалі першы нумар выставачнай газэты „Соцыялістычная рэконструкцыя", якую вязьлі прадстаўнікі лейпцыгскіх рабочых сваім рабочым у Нямеччыну.

Буржуазія, вядучы ўвесь час шалёнае цкаваньне супроць Савецкага Саюзу, узводзячы розныя паклёпы у сваёй прэсе на СССР, баіцца праўды аб Савецкім Саюзе, якая ўсё-ж так ці іначай, даходзіць да замежных працоўных. Недарма рабочыя з Нямеччыны, **т. Бэсьлер і Рыхтэр,** у сваім лісьце ў рэдакцыю выставачнай газэты, пішуць: „праўда, аб якой гаворыць ваша выстаўка, мовай лічбаў і фактаў, рана ці позна, усёроўна трапіць да рабочых і сялян ня толькі Польшчы, але і Нямеччыны і інш. краёў. Ніякія перашкоды Пілсудзкіх гатаму не пашкодзяць.. Будзьце ўпэўнены,—мы выканаем наш абавязак і раскажам праўду аб тым, што бачылі ў вас. Праз наш комуністычны друк мы будзем выкрываць хлусьню аб вашай краіне. Мы будзем выкрываць сапраўдны твар соцыял-фашыстых і абяцаем вам мобілізаваць клясава-сьвядомых пролетараў на абарону Савецкага Саюзу. Мы абяцаем падрыхтаваць вялікі чырвоны фронт для змаганьня за сусьветную рэволюцыю".

Зусім ясна, чаму буржуазія баіцца праўды аб СССР. Нашы посьпехі—гэта посьпехі пролетарыяту замежных краёў. Посьпехі, за заваеву якіх, пад сьцягам Комінтэрну ў сусьветным маштабе, змагаецца пролетарыят, працоўнае сялянства і прыгнечаныя народы калёній.

Заклік колгасьнікаў да працоўных Зах. Беларусі

У № 9 газэты „Соцыялістычная Рэконструкцыя" зьмешчан ліст колгасьнікаў-экскурсантаў усебеларускай выстаўкі колгасаў „Новае Жыцьцё", „На варце", імя Вароўскага, Тураўскага раёну, да працоўных сялян Зах. Беларусі, у якім яны пішуць: „нашы посьпехі гэта ёсьць і вашы посьпехі, нашы дасягненьні будуць усяляць у вас дух бадзёрасьці, гартаваць у вас рэволюцыйныя сілы, упэўненасьць у перамогу. Нашы посьпехі яшчэ шчыльней згуртуюць вас пад кіраўніцтвам сваёй комуністычнай партыі, пад сьцягамі Комінтэрну для рашучых боек з капіталам. Мы заклікаем вас змагацца пад кіраўніцтвам пролетарыяту і яго комуністычнай партыі да пераможнага канца".

Чаму такая сіла ў нашых посьпехах

Нашы посьпехі захоўваюць у сябе вялікія сілы. Выстаўка, уздымаючы новы энтузіязм у працоўных масах, вылучыла з іх новыя кадры найактыўнейшых перадавых змагароў за сацыялізм, умацавала інтэрнацыянальную солідарнасьць працоўных усіх нацыянальнасьцяй, дэмонструючы посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, уздымала іх рэволюцыйны дух, рэволюцыйную сілу.

Такія ўласьцівасьці выстаўкі вынікаюць з тых сіл, якія тояць у сабе нашы посьпехі. Здабытыя ў жорсткай клясавай барацьбе, на аснове правільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі ў гаспадарчым і культурна-нацыянальным будаўніцтве, дзякуючы непрымірымай барацьбе з усякімі адхіленьнямі ад партыйнай лініі, нашы посьпехі самі зьяўляюцца ня толькі вынікам папярэдняй барацьбы, але-ж і мобілізуючай сілай шырокіх працоўных мас для заваёвы пад кіраўніцтвам партыі новых посьпехаў, новых перамог.

Газэта на выстаўцы

Уздым наведаўшых выстаўку працоўных мас і афармленьне яго ў конкрэтныя справы можна было прасачыць на старонках выставачнае газэты „Соцыялістычная рэконструкцыя". Газэта адыграла вялікую ролю на выстаўцы.

1) Яна, зьяўляючыся штодзённай газэтай, якая дасылалася ў колгасы БССР, популярызавала выстаўку, паасобныя яе часткі і экспонаты. Газэтай былі апісаны ўсе павільёны і аддзелы. 2) Газэта афармляла на сваіх старонках уздым мас экскурсантаў у сувязі з выстаўкай. На яе старонках было надрукавана каля 60 рапартаў колгасьнікаў, экскурсантаў і колгасаў аб самамобілізацыі ў сувязі з адозвай ЦК УсеКП(б) і кампаніямі. Таксама было надрукована шмат заяў аднаасобнікаў аб уступленьні ў колгасы ў сувязі з адозвай. 3) Газэта, змагаючыся з асобнымі скажэньнямі партлініі і недахопамі ў рабоце выставачнага мэханізму, дапамагала максымальнаму выкарыстаньню выстаўкі для пропаганды нашых задач. 4) Газэта, у сваю чаргу, сама зьяўлялася экспонатам, і тысячы экскурсантаў мелі магчымасьць азнаёміцца з будаўніцтвам газэты.

Такім чынам газэта зьяўлялася органічнай часткай выстаўкі. І калі выстаўка зьяўлялася люстрам нашых дасягненьняў, нашага будаўніцтва, дык газэта была люстрам уздыму рэволюцыйнага патосу мас наўкола нашых дасягненьняў, нашага будаўніцтва.

* * *

Наша задача зараз у тым, каб выкліканы выстаўкай сярод тысяч экскурсантаў і працоўных мас уздым, поўнасьцю выкарыстаць для выкананьня чарговых задач соцыялістычнага будаўніцтва, вызначаных XIII зьездам КП(б)Б і XVI УсеКП(б).

М. Пузікаў.

РАДЫЁ-ТЭЛЕГРАМА

Усім тройкам пры цэнтральных установах і гарадзкім і раённым штабам культэстафэты

Усебеларускі штаб культэстафэты загадвае: прадставіць штабу не пазьней 5 лістапада пляны работы тройк і штабаў на пэрыод правядзеньня культэстафэты.

Усебеларускі штаб культэстафэты

НА ШЛЯХУ 3-га ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

У БОЙ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Сёньня скончыўся тэрмін уключэньня ў конкурс за пераходныя сьцягі. Закасаўшы рукавы, змагацца за аўладаньне сьцягамі, за перавыкананьне пляпаў 5-га ўдарнага кварталу

Стаць на чале творчай актыўнасьці рабочай моладзі—баявая задача комсамолу

ЗМАГАЕМСЯ ЗА СЬЦЯГ

Чырвонаштандартны завод „Бальшавік" уключыўся ва ўсесаюзны конкурс. Уключэньне ў конкурс дало значны штуршок у рабоце заводу.

Завод мае ўжо шэраг дасягненьняў. Жалацінны цэх, які ўвесь час ня выконваў свой прамфінплян, даў перавыкананьне заданьняў па экспортнаму клею на 10 проц. Гэты цэх упяршыню перайшоў ад ударнай брыгады на ўдарныя зьмены і скразныя брыгады. Адна брыгада адказвае перад другою Значна зьменшыліся прагулы. Калі ў мінулыя два месяцы жнівень—верасень было па 12-13 прагулаў, дык у кастрычніку яны зьнізіліся да 2-х. Асобныя брыгады, як брыгада раскладчыц клею, зьнізілі расцэнкі ў добраахвотным парадку на 20 проц.

Хромавы цэх выканаў прамфінплян у колькасным выразе на 100,92 проц., а ў стасунку кошту на 116,32 проц. Увесь завод за 25 дзён кастрычніка выканаў заданьне па колькасьці на 111,8 проц., а па кошту на 102,81 проц. Значна зьменшыліся прагулы. Перазаключэньне соцыялістычных дагавораў на заводзе прайшло пры вялікай акрыўнасьці ўсіх рабочых. 300 рабочых закантрактавалі сябе за заводам да канца пяцігодкі.

На сходзе прагульшчыкаў, які ўпяршыню быў склікан брыгадай па барацьбе з прагуламі, прагульшчыкі абяцалі энэргічна працаваць на заводзе.

У некаторых цэхах, як жалацінны праз ... вывешваюць сьпісы прагульшчыкаў. Шматтыражка „Рабочае Вока" друкуе чорныя і чырвоныя сьпісы добрых і дрэнных працаўнікоў.

У хромавым цэху комсамольская брыгада паказвае сапраўдныя ўдарныя тэмпы работы. Сярод комсамольцаў выжыты прагулы і спазьненьні.

Заўважваюцца яшчэ в... Члены партыі Гаеўскі і Ігнацені запрасілі за адну працу 100 рублёў, тады як іншыя рабочыя зрабілі гэту працу за 60 рублёў.

Культурна-масавая праца на заводзе не пастаўлена на належную вышыню. З боку некаторых організацый і прыватназьвы комсамольскага колектыву мала зроблена ў гэтай галіне.


Комсамольскаму колектыву неабходна будзе пераключыцца на ўдарныя тэмпы работы з тым, каб сапраўды стаць на чале рабочай моладзі ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну і атрыманьне ганаровага сьцягу.

З. Мінькін.

Адкрыты ліст комсамольцаў ячэйцы і рабочым „Эльводу"

Таварышы! Менская швейная ф-ка „Кастрычнік" мае вялікія посьпехі ў справе шырокага разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Дзякуючы бальшавіцкай мобілізацыі шырокіх рабочых мас мы выканалі прамфінплян за год на 101 проц., павысілі вытворчасьць працы на 46 проц., зьнізілі сабекошт на 14,8 проц.

Значныя перабоі ў нашай працы меліся з-за частага недахопу



электрычнай энэргіі. За апошні месяц наша ф-ка прастаяла без работы 11 гадзін 28 хвілін, што нанесла страту ў 900 рублёў.

Фабрыка ўключылася ў бой за атрыманьне сьцягу ЦК КП(б)Б. Сёньня яна ўступае у вытворчыя манэўры.

Таварышы эльводаўцы! Нашы манэўры цалкам залежаць ад вас. Мы лічым, што „Эльвод", які дае электраэнэргію манэўруючым фабрыкам і заводам павінен абавязкова ўключыцца ў вытворчыя манэўры, перавесьці сваю працу на баявыя тэмпы работы з тым, каб ня прымусіць манэўруючыя фабрыкі і заводы стаць з-за недахопу электраэнэргіі.

Ячэйка ЛКСМБ мэханікаў ф-кі „Кастрычнік".

ПАЧЫНАЕМ ВЫТВОРЧЫЯ МАНЭЎРЫ

Для ліквідацыі прарываў на транспартных прадпрыемствах ЦП саюзу транспартнікаў рашыла пачаць з 1-га па 10-ае лістапада вытворчыя манэўры. Саюзтранс за кастрычнік м-ц меў у сваёй працы прарыў, які зараз неабходна ліквідаваць.

У час манэўраў нам неабходна перавесьці на баявую гатоўнасьць усе транспартныя прадпрыемствы Менску, організаваць найхутчэйшую разгрузку і выгрузку грузаў на чыгунцы, організаваць лепшую дастаўку грузаў са станцыі ў горад і наадварот,—узьняць вытворчасьць працы на транспарце, выканаць рашэньні зьлёту ўдарнікаў.

Прамфінплян усіх транспартных прадпрыемстваў на 5-ты квартал павінен быць выканан. У гэтай галіне неабходна дапамога комсамольскай організацыі, якая павінна прыкласьці ўсе сілы да ліквідацыі прарываў і лепшай організацыі справы.

Прэзыдыум ЦК саюзу транспартнікаў Беларусі, падтрымліваючы ініцыятыву гомельскіх друкароў, пастанавіў правесьці з 1-га лістапада манэўры на прадпрыемствах Менску. Пасьля гэтага манэўры будуць перакінуты на гомельскі вузел. ЦП саюзу кінула ўсе сілы на правядзеньне гэтых манэўраў з тым, каб ліквідаваць прарывы і як мага лепш выканаць пляны 5-га ўдарнага кварталу.

М. Белазоўскі.

Кляса супроць клясы

ЗГОДА АБ ЗДРАДНІЦТВЕ ПАДПІСАНА.

«Заявеце, што вы плюяцё на згоду, заключаную соцыял-здраднікамі».

БЭРЛІН, 29. Перагаворы ў міністэрстве працы між прадстаўнікамі ўраду Брунінга, прадпрыемцамі і рэформісцкімі профсаюзнымі правадырамі закончыліся ўчора наступнай згодаю:

Праца на прадпрыемствах безадкладна аднаўляецца на ранейшых умовах. Прадпрыемцы абавязваюцца не звальняць рабочых за ўдзел у забастоўцы. Для вырашэньня нанова пытаньняў, зачэпленых рашэньнем трацейскага суда ад 10 кастрычніка, утвараецца спэцыяльны арбітражны суд, у складзе трох „нэйтральных" асоб, якія назначаюцца міністрам працы. Арбітражны суд павінен прыступіць к рабоце ў самым хуткім часе з тым, каб вынесьці рашэньне не пазьней першых лічбаў лістапада, якое павінна лічыцца канчатковым. Старшынёю арбітражнага суда будзе назначаны, мабыць, былы міністр працы, член партыі цэнтру, доктар Браун.

Учора граньдыёзная конфэрэнцыя рэволюцыйнай профопозыцыі ў цырку Буша вынесла пастанову аб пашырэньні забастоўкі і аб неабходнасьці ўжыць усе сродкі для дасягненьня перамогі.

„Наладжвайце безадкладна сходы і заявеце, што рашэньне будзе вынесена не здрадніцкімі профсаюзнымі правадырамі, а вамі самімі!

Заявеце, што вы плюяцё на заключаныя імі згоды, што вы не вяртаецеся на прадпрыемствы, што вы будзеце працягваць забастоўку пад кіраўніцтвам тых правадыроў, якія будуць абраны вамі".

Сыгуранца ўжывала выключна жорсткія мардаваньні

ВЕНА, 30. Як паведамляюць з Бухарэсту, румынская прокуратура здолела прад'явіць абвінавачаньне ў „шпіёнажы" толькі 20 з некалькіх сот арыштаваных за апошні час. У адносінах астатніх арыштаваных за апошні час спробы прокуратуры і ахранкі давесьці іх прыналежнасьць да „шпіёнажу" аказаліся бясплоднымі.

Сыгуранца (Румынская ахранка) была прымушана абвясьціць, што вялікая колькасьць арыштаванай моладзі зьяўляецца толькі членамі Міжрабпому і ня мае дачыненьня да шпіёнажу.

Па атрыманых вестках, усе арыштаваныя падпаразкаваліся ў Сыгуранцы выключна жорсткім катаваньням.

Сыгуранца захапіла ў якасьці заложнікаў жонак і дзяцей арыштаваных для таго, каб прымусіць даць патрэбныя ёй паказаньні.

Паліцыя адкрыла агонь па сялянах

ВАРШАВА, 30. У вёсцы Латыца, Даброўскага басэйну паліцыя гэтымі днямі арыштавала кандыдата сьпісу рабоча-сялянскага адзінства. Абураныя арыштам сяляне ў колькасьці каля тысячы чалавек сабраліся каля паліцэйскага паста, намерваючыся адбіць арыштаванага. Прыбыўшы з Здомбковіц атрад коннай паліцыі прыняўся разганяць натоўп, прычым адкрыў агонь па сялянах. Шмат раненых, у тым ліку жанчыны і д...

Парушылі супакой амэрыканскіх мільянэраў



Бастуючыя швейнікі адважыліся наладзіць дэмонстрацыю на вуліцы, дзе жывуць мільянэры (5 Авэню), з патрабаваньнем павышэньня іх галоднай зарплаты.

Сярод арыштаваных 25 жанчын.

На здымку: Пасадка арыштаваных у „Чорны Воран".

Беспрацоўе ўзрасло ў 7 раз

БЭРЛІН 28. Як паведамляюць з Жэнэвы, міжнароднае бюро працы пры лізе нацый у апублікаванай ім статыстыцы сусьветнага беспрацоўя к канцу жніўня 1930 году адзначае, што ва ўсіх капіталістычных краінах, за выключэньнем Францыі і асабліва прамысловых краінах нагадаецца вялікі рост беспрацоўя ў параўнаньні з мінулым годам. Першае месца па беспрацоўі займаюць Нямеччына і Англія; у Галяндыі і Чэха-Славакіі лік беспрацоўных падвоіўся, у Бэльгіі і Канадзе—патроіўся. У Амэрыцы лік беспрацоўных вызначаецца ў 22 проц. усіх рабочых, у той час, калі ў мінулым годзе яно раўнялася толькі 9 проц. У Румыніі лік беспрацоўных узрос у 7 раз. Моцна ўзрасла лічба беспрацоўных у Італіі, у Польшчы і Швэцыі.

Міжнародная хроніка

* 25-26 кастрычніка ваенныя польскія самалёты зноў зрабілі палёты над нямецкай тэрыторыяй.

* Залаты запас францускага банку перавысіў 56 мільярдаў франкаў. Залатое забясьпечаньне банкнот перавысіла вызначаную законам норму 35 проц. і дасягнула 54 проц.

* Грэцкі прэм'ер-міністр Вэнізэлос і міністр замежных спраў Міхалакопулос прыняты прэзыдэнтам турэцкай рэспублікі Кемаль-пашою. 30 кастрычніка будзе падпісан дагавор аб дружбе і згодзе аб абмежаваньні ваенна-морскіх узбраеньняў.

Ліквідаваць фінансавыя прары...

РАЗЬБІЦЬ ПРАВАОПОРТУНІСТЫЧНУЮ СТАЎКУ НА „САМАЦЁК"

Політычная недаацэнка задачы ліквідацыі фінпрарыву з боку некатор... ЖАКТ'аў Менску зрывае выкананьне кантрольных лічбаў па паянакапленьн...

Невыкананьне фінпляну—удар па прамфінпляну

Падхапіць пачын комсамольцаў ячэйкі БЖС

Жылкоопэрацыя зьяўляецца адной з крыніц мобілізацыі ўнутраных сродкаў на ліквідацыю фінансавага прарыву. На гэтым вучастку ў асаблівасьці павінна была быць мобілізавана ініцыятыва працоўнага насельніцтва на датэрміновай выплаце належных плацяжоў.

Аднак, шмат ЖАКТ'аў, замест таго, каб стаць сапраўднымі організатарамі, кіраўнікамі ў мобілізацыі сродкаў насельніцтва, самі цягнуцца ў хвасьце, пераважным мэтадам у іх рабоце яшчэ на сёньняшні дзень зьяўляецца „самацёк". Наглядаецца шэраг фактаў наяўнай права-опортуністычнай недаацэнкі гэтай важнейшай політычнай задачы.

Белжылсаюз свячасова мобілізаваў усе свае сілы на разьмеркаваньне дадзенага заданьня сярод ЖАКТ'аў і ЖСКТ. Усяго Белжылсаюз павінен быў сабраць за 3 месяцы 400 тысяч рублёў, у прыватнасьці па Менску—87.000 рублёў. У асобым квартале з 1-га кастрычніка па 1-ае студзеня па Менску трэба сабраць 93.000 рублёў. Гэтая лічба разьмеркавана па ЖАКТ'ах і ЖСКТ. ЖАКТ'ы павінны даць 41.000 рублёў.

Выканалі ўсяго на.. 22 проц.

Паглядзім-жа як і наколькі выканана і выконваецца заданьне ЖАКТ'амі. Да 1-га кастрычніка, г. зн. па першы квартал, заданьне выканана ўсяго на 22 проц. Цяпер-жа гэта справа праходзіць надзвычайна марудна,—знаходзіцца пад наяўнай пагрозай зрыву.

Пытаньне, дзе-ж асноўная прычына невыкананьня дадзеных дзяржаўных заданьняў?

Адказ відавочны, нацяжвацельскія, безадказныя адносіны з боку некаторых кіраўнікоў ЖАКТ'аў.

Белжылсаюз вылучыў 4-х інструктароў для організацыі работы па ўцягненьню новых пайнікаў у Жылкоопэрацыю, па свачасоваму збору паю і наогул па праверцы ходу паянакапленьня па ЖАКТ'ах і організацыі грамадзкай думкі навакол гэтай задачы.

Інструктары не атрымалі належнай дапамогі з боку некаторых праўленцаў ЖАКТ'аў. Імі выяўлена безадказнае становішча ў гэтай справе, аб чым яскрава сьведчаць дакладныя запіскі інструктароў БКС.

„Вузоры" права-опортуністычнай недаацэнкі гэтай справы і спазьняваньня на самацёк паказалі пасёлак „Комінтэрн", „Іскра" і ЖАКТ № 7.

Вось што піша інструктар Ігнацьцеў:

У пас. „Комінтэрн" стварылася надзвычайна дрэннае становішча са зборам паёў. Партыйная частка ня толькі плянецца ў хвасьце, але, у некаторых выпадках, самі партыйцы зьяўляюцца ініцыятарамі выступленьняў супроць збору паёў, дэмаралізуючы гэтым работу па паянакапленьню.



У экстазе права-портуністычнага благапалучча

5 чалавек партыйцаў (Жытнковіч, Фарботка, Ігнаценка, Ерынброз О. і Котаў А.) адмовіліся плаціць паявыя ўзносы. З іх 2 чалавекі ўпасьледку зьнялі свае подпісы і цяпер плоцяць пай.

Стаўка на „нерэальныя" лічбы

Гэтыя пайшчыкі сваёй адмовай плаціць пай зрываюць усю работу. Астатняя маса гаворыць,—яны ня плоцяць і мы плаціць ня будзем. Рабочы заводу „Бальшавік"—Страсек—заяўляе: „Растраляйце мяне, а плаціць ўсё-роўна ня буду". Працаўнікі, і нават партыйцы не даюць належнага адпору падобным настроям і выступленьням.

Ня лепш ідзе справа і ў ЖАКТ'е № 7. Падрыхтоўкі да мобілізацыі сродкаў сярод жыхароў ЖАКТ'аў амаль ня было. З 1720 наймальнікаў кватэр—пайнікаў усяго 500 чалавек. Старыя пайнікі маюць шмат запазычанасьці, пераразьлікі з імі ня зроблены. Паявыя ўзносы бяруцца стыхійна, калі пайнік напамінаў ня робіць, дык і не спаганяюць.

Заявы ад жыхароў на залічэньне ў пайнікі доўга не разьбіраюцца. У ЖАКТ'е нярухома ляжаць заявы з студзеня м-ца мінулага году з рэзалюцыямі: „высьветліць". У ... не вярбуюць, заявы паступаюць ... хійна. Сам старшыня праўленьн... дыходзіць да гэтай справы н... ёзна, формальна.

У першым ЖАКТ'... св... на на Белжылсаюз, што ён ад... рэальныя" лічбы, не ўлічыўшы ... сурсаў. Такія факты ўхіленьн... выкананьня вызначаных лічбаў ... мячаюцца і за старшынёю Ж... № 7—тав. Зэльцманам.

У выніку опортуністычнай ацэнкі гэтай работы, у ЖАКТ'е заданьне выканана ... на 5 ... і толькі зараз праўленьне Ж... думае ўзьняць грамадзкую думк... гэтуль работа праходзіла „сама... Не адбылося ніводнага сходу ... роў, ніводнай фракцыі парт... комсамольцаў, спэцыяльна пр... чаных гэтаму пытаньню. Праў... толькі цяпер мяркуе склікаць ...

Падхапіць пачын

Комсамольская ячэйка Белжыл... абмеркаваўшы пагражлючае с... шча са зборам паёў і рэалізацы... зыкі „5 годка—у 4 гады", вы... ўдарную брыгаду з 20 комсамо... для конкрэтнай дапамогі ЖАК... зборы паю, уцягненьня новых ... у жылкоопэрацыю, мобілізацыі ... гэтых задач грамадзкае думкі.

Комсамольскія групы пры... ўжо да сваёй работы. Яны да... юць у правядзеньні выбараў ... маў, непасрэдна зьвязваюцца ... боту з ўцягненьнем новых пайн... жылкоопэрацыю. Разгортваецца ... спаборніцтва паміж ЖАКТ'амі ... хутчэйшую рэалізацыю кантр... лічбаў па паянакапленьню, орг... ваюцца ўдарныя брыгады.

Гэты пачын комсамольцаў БЖ... вінны падхапіць усе комсам... ячэйкі, якія непасрэдна зна... пры гаржылсаюзах, ЖСКТ і г. ...

Трэба безадкладна пераключы... бальшавіцкія тэмпы работы. ... патрабуе ад нас партыя і ўлада ... га патрабуюць задачы соцыя... нага будаўніцтва. Трэба моц... мятаць, што павольнасьць у ... наньн пляну мобілізацыі ср... сельніцтва павінна разглядаць... праўленьне правага ўхілу на ... тыцы.

С. Сья...

Правыя опортуністы цкуюць рабкора

Комсамолец, рабселькор, рабочы Міх. Сонін выкрыў на рабфакаўскай комсамольскай ячэйцы права-опортуністычную практыку і прымірэнцтва да яе з боку бюро ячэйкі, якія выявіліся ў тым, што комсамолец рабфакаўскай ячэйкі Тамаркін высоўваў „тэорыю", што політычнаю апораю на вёсцы павінен быць заможнік, а не батрак беднак і колгасьнік. Комсамолец Пузанкоў, праводзячы выбары на бядняцкую конфэрэнцыю, замест батракоў і беднякоў праводзіў кандыдатуры заможнікаў, што зьяўляецца правым опортунізмам на практыцы.

Бюро ячэйкі рабфаку прымірэнча да гэтага аднеслася. Тав. Сонін, у сваім допісе ў газэту «За пролетарскія кадры", а таксама на сходзе акадэмічнага колектыву ЛКСМБ абвінавачваў бюро ячэйкі рабфаку ў прымірэнцтве.

Сход колектыву бязумоўна згадзіўся з ацэнкай тав. Соніна і прапанаваў бюро колектыву разгледзець справу рабфакаўскай ячэйкі. Бюро рабфакаўскай ячэйкі адтрымала спагнаньне (суровую вымову) „Актывістыя" з рабфакаўскай ячэйкі лічылі патрэбным адпомсьціць тав. Соніну. Прыпісваючы зусім неабгрунтаваныя факты тав. Соніну, бюро яч. выключае яго з КСМ.

Бюро РК КСМ разгледзеўшы гэту справу, адмяніла пастанову ячэйкі і вынесла тав. Соніну вымову. Аднак бюро РК зусім бюрократычна аднеслася да гэтага пытаньня, не зрабіла політычных вынікаў, ня прыдала політычнага значэньня гэтай справе, чым об'ектыўна ўзяла пад сваю абарону правaопортуністычныя дзеяньні бюро ячэйкі.

Райком ЛКСМБ павінен перагледзець сваю пастанову ў адносінах т. Соніна, і даўшы патрэбную політычную ацэнку, зрабіць організацыйныя вывады ў адносінах бюро рабфакаўскай ячэйкі ЛКСМБ.

ДЗЕД АВІЎ.

...А профсаюз адмовіў

Пры організацыі ФЗВ швейнікаў было ўзята з дзіцячых дамоў і піонэрдому 100 выхаванцаў. Гэтыя падлеткі ня маюць сродкаў набыць сабе вопратку. На забясьпечаньне ўсіх вучняў патрэбна 10685 руб.

Помдэт ахвусьціў 2000 руб., Наркамасьветы—700 руб., прыхільнік дзьцей 2000 руб., Белшвейаб'яднаньне—2500, а саюз швейнікаў... нічога, адгаварыўшыся тым, што даў трэст.

Мы атрымалі ўсяго 7200 руб., што ні ў якім разе ня можа нас задаволіць.

Бясьпечныя адносіны профсаюзу да ФЗВ, адмаўленьне ў дапамозе выхаванцам адзежаю пагражае зрывам нормальнай працы і вучобы.

Гольдзін

Дактароў бачылі раз ... месяцы

Койданаўская райбольніца ... працавала конкрэтны плян ... слугоўваньню ўсіх колгасаў ... гасаў раёну. Такім чынам, ... трэбна выехаць у кожны ... колгас два разы ў месяц дзеля ... агляду колгасьнікаў. Але на ... нешні дзень маецца такое ... шча: у комуну „Чырвоны ... дактары прыехалі толькі раз ... месяцы. Трэба адзначыць, што ... райбольніца, так і савет ком... мэдыцынскае абслугоўваньне ... зьвяртаюць патрэбнай увагі.

Прыклад таварыша Бабіча

У савгасе „Маладая Гв... цыя", Чэрвеньскага раёну, ... агульным сходзе ячэйкі ЛКС... сабрана падпіска на па... „Пяцігодка—у чатыры г... на агульную суму 1325 ...

Рабочыя савгасу „Мал... Гвардыя" добра зразу... важнасьць пазыкі. З боку ... бочых і адміністрацыі ... выпадкі падпіскі на 20... 300 проц. месячнага зар... ку. Рабочы савгасу, т. ... біч Мікола, які атрым... ў сярэднім 30 рублёў у ... сяц, падпісаўся на 100 ... лёў пазыкі.

Міхась Раніт...

Адказны рэдак...
Рэдкол...

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 5...